# Тэма 5 ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ



## § 22. Колькасць, размяшчэнне і натуральны рух насельніцтва

***Успомніце.*** *Якая колькасць насельніцтва свету? Назавіце краіны — лідары па колькасці насельніцтва. У якіх рэгіёнах і краінах высокая шчыльнасць насельніцтва?*

**1. Дынаміка колькасці насельніцтва.** Колькасць насельніцтва — галоўны паказчык, з якога пачынаецца характарыстыка насельніцтва краіны. Асноўнай крыніцай даных пра яго колькасць з'яўляецца перапіс насельніцтва. Паводле апошняга перапісу, які праводзіўся ў 2019 г., у Беларусі пражывала 9413,5 тыс. чал. (мал. 80).

Першы перапіс насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. налічваў 6673,0 тыс. жыхароў, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі. На працягу многіх гадоў колькасць насельніцтва краіны павялічвалася.




Мал. 80. Дынаміка колькасці насельніцтва (у сучасных межах, тыс. чал.)

У БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яна складала 9,1 млн чал., пасля яе заканчэння — скарацілася да 6,2 млн чал. Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара. Толькі ў 1972 г. колькасць насельніцтва дасягнула даваеннага ўзроўню. Сацыяльна-эканамічны крызіс у 1991–1994 гг. прывёў да яе скарачэння. Пасля 2009 г. тэмпы скарачэння колькасці насельніцтва знізіліся, а ў асобныя гады нават назіраўся нязначны рост. Па даных на канец 2023 г., у Беларусі пражывае 9200,6 тыс. жыхароў. Па колькасці насельніцтва Рэспубліка Беларусь займае 98-е месца ў свеце, 7-е месца сярод краін СНД.

Якія сацыяльна-эканамічныя і экалагічныя фактары паўплывалі на змяненне колькасці насельніцтва Беларусі на мяжы XX–XXI стст.?

Дэмаграфічная бяспека — найважнейшы складнік нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Дзяржавай праводзіцца дэмаграфічная палітыка, накіраваная на стварэнне ўмоў для росту колькасці насельніцтва, умацаванне інстытута сям'і, павышэнне агульнага ўзроўню здароўя народа, ахову мацярынства і дзяцінства, падтрымку шматдзетных сямей. Меры, якія прымаюцца, дазволілі стабілізаваць тэмпы зніжэння колькасці насельніцтва.

**2. Размяшчэнне насельніцтва.** Пад размяшчэннем насельніцтва разумеецца яго размеркаванне на пэўнай тэрыторыі і фарміраванне сеткі паселішчаў. Да асноўных фактараў размяшчэння насельніцтва можна аднесці прыродны, гістарычны, сацыяльна-эканамічны і экалагічны. Доўгі час адным з галоўных фактараў размяшчэння насельніцтва быў прыродны. Людзі сяліліся на раўнінных тэрыторыях, каля прыродных вадаёмаў, асвойвалі больш урадлівыя глебы. Важнае значэнне меў гістарычны фактар, які выяўляўся ў асаблівасцях засялення тэрыторыі на розных этапах яе асваення. У наш час прыродны і гістарычны фактары аслабелі. Размяшчэнне насельніцтва рэгулююць сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця: развіццё вытворчасці, сферы паслуг, наяўнасць транспартных шляхоў і інш. На размяшчэнне насельніцтва паўплываў і экалагічны фактар. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС многія тэрыторыі сталі непрыдатнымі для пражывання людзей.

Асноўным паказчыкам размяшчэння насельніцтва па тэрыторыі краіны з'яўляецца шчыльнасць насельніцтва. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі складае 44,3 чал./км$^2$, але існуюць рэгіянальныя адрозненні. Максімальная шчыльнасць насельніцтва ў Мінскай вобласці, у тым ліку ў г. Мінску, — 86 чал./км$^2$, далей — у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — каля 40 чал./км$^2$, а найменшая — у Віцебскай — 27 чал./км$^2$.

Як разлічваецца сярэдняя шчыльнасць насельніцтва?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Больш за 78 % насельніцтва Беларусі пражывае ў гарадах. Колькасць гарадскога насельніцтва ў цяперашні час складае 7,2 млн чал. Самыя высокія тэмпы павелічэння колькасці гарадскіх жыхароў адзначаюцца ў Мінску (1,9 млн чал.). Прырост насельніцтва адзначаецца і ў абласных цэнтрах. Колькасць сельскага насельніцтва значна меншая за колькасць гарадскога — менш за 2 млн чал.

З 2005 г. па ініцыятыве Кіраўніка дзяржавы рэалізавана серыя дзяржаўных праграм па адраджэнні і развіцці вёскі. Рэалізацыя праграм стымулявала ўстойлівы рост сацыяльнай сферы сельскіх паселішчаў і зрабіла іх больш прывабнымі для пражывання.

Прааналізуйце карту атласа (с. 33) і вызначце гарадскія паселішчы, у якіх прырост насельніцтва захоўваецца.

Больш высокая шчыльнасць сельскага насельніцтва фіксуецца ў Мінскім раёне, у раёнах з абласнымі цэнтрамі і некаторых раёнах, якія прылягаюць да Мінскага.

На карце атласа (с. 31) знайдзіце адміністрацыйныя раёны са шчыльнасцю сельскага насельніцтва больш за 15 чал./км$^2$.

**3. Нараджальнасць, смяротнасць і натуральны прырост.** У любой краіне ўвесь час змяняецца колькасць насельніцтва. Часцей за ўсё яе змены залежаць ад натуральнага прыросту / натуральнага змяншэння. У Беларусі на працягу многіх гадоў нараджальнасць перавышала смяротнасць. У 1960-я гг. натуральны прырост складаў 146,2 тыс. чал. на год. Напрыканцы 1980-х гг. ён зменшыўся да 50,0 тыс. чал. і працягваў зніжацца ў 1990-я гг., калі смяротнасць перавысіла нараджальнасць. На змену натуральнаму прыросту прыйшло змяншэнне насельніцтва, што прывяло да дэпапуляцыі.

Што называецца натуральным прыростам, ад якіх паказчыкаў ён залежыць?

**Дэпапуляцыя** — працэс скарачэння колькасці насельніцтва ў краіне па прычыне натуральнага або міграцыйнага змяншэння, адмоўнай дынамікі колькасці насельніцтва.

Натуральны прырост зніжаўся ў сувязі з памяншэннем нараджальнасці. У 1989 г. агульны каэфіцыент нараджальнасці складаў 15,1 на 1000 чал., а да наступнага перапісу (1999 г.) ён знізіўся да 9,3. Пачынаючы з 2005 г. нараджальнасць у краіне стала павялічвацца. Гэтаму спрыялі меры дэмаграфічнай бяспекі. Да 2009 г. каэфіцыент

Якія меры былі прыняты для павелічэння нараджальнасці?

нараджальнасці вырас да 11,5, што вышэй, чым у краінах Еўропы. У 2019 г. назіралася нязначнае зніжэнне нараджальнасці.

Другі працэс, які вызначае характар натуральнага руху насельніцтва, — смяротнасць. У сярэдзіне XX ст. у Беларусі яна зніжалася, расла сярэдняя працягласць жыцця. У другой палове XX ст. смяротнасць стала павялічвацца. Найбольш высокія тэмпы павелічэння смяротнасці назіраліся паміж перапісамі 1989 і 1999 гг. (з 10,6 да 14,2 на 1000 чал.). Пачынаючы з 2010 г. назіраецца зніжэнне агульнага каэфіцыента смяротнасці да 12,8 на 1000 чал.

На карце атласа (с. 33) вызначце раёны, для якіх характэрны натуральны прырост насельніцтва.

**Падвядзём вынікі.** Колькасць насельніцтва Беларусі на 2023 г. — 9200,6 тыс. чал. Сярэдняя шчыльнасць насельніцтва — 44,3 чал./км$^2$.

Найбольшая шчыльнасць насельніцтва ў Мінскай вобласці, найменшая — у Віцебскай. Колькасць гарадскога насельніцтва перавышае колькасць сельскага.

***Праверце сябе.*** 1. Што такое размяшчэнне насельніцтва? 2. Якія фактары ўплываюць на размяшчэнне насельніцтва? 3. Якая сярэдняя шчыльнасць насельніцтва Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Назавіце прычыны змянення колькасці насельніцтва Беларусі ў канцы XX — пачатку XXI ст. 2. Якія фактары паўплывалі на размяшчэнне насельніцтва вобласці, у якой вы жывяце?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Па даных малюнка 80 разлічыце тэмпы прыросту і змяншэння насельніцтва Беларусі (гарадскога і сельскага) і растлумачце прычыны змянення колькасці насельніцтва на кожным адрэзку.

## § 23. Полаўзроставая структура насельніцтва. Працоўныя рэсурсы

***Успомніце.*** *Чаму важнай часткай насельніцтва з'яўляюцца працоўныя рэсурсы?*

**1. Полаўзроставая структура насельніцтва.** Насельніцтва любой краіны адрозніваецца па ўзросце і поле, што звязана з асаблівасцямі ўзнаўлення і ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця. Па ўзросце і ступені працаздольнасці насельніцтва падзяляецца на тры групы: маладзейшыя за працаздольны ўзрост, працаздольнага ўзросту і старэйшыя за працаздольны ўзрост. Доля кожнай узроставай групы насельніцтва ў працэсе гістарычнага развіцця змяняецца. Па ўзроставай структуры насельніцтва Беларусь падобная да многіх краін Еўропы. Яна характарызуецца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне